## МЫ ЕДЗЕМ!

...Ніхто, мусіць, не ведае, чаму звяздоўскія суперпрызы так любяць, адны раёны і... не любяць другія. Бо вось на Маларытчыну, напрыклад, ні разу не траплялі (прынамсі пакуль...), а на Смаргоншчыну — ці не трэці ўжо?

Але ж няхай і пяты, — куды прызы, туды і маленькі звяздоўскі дэсант: каб пазнаёміцца са шчаслiўчыкам, каб налагодзіць сувязь, каб выслухаць крытычныя заўвагі і кампліменты, каб уручыць прызы лепшым звяздарам-паштальёнам, каб знайсці, мо, новых сяброў. Але ж найперш — не абмінуць старых. А таму ў аўторак у 11 гадзін дзень падпісчыка «Звязды» (з уручэннем халадзільніка «Атлант» Галіне Юльянаўне Свірскай з в. Дзенавішкі) адбудзецца ў Смаргоні, у 13 — у Астраўцы, у 16 — у Ашмянах.

Падрабязней пра час і месца сустрэч — у наступных нумарах.

**Валянціна ДОЎНАР, Тацяна ЛЯЎКОВІЧ, Уладзімір ЗДАНОВІЧ, Марыя ЖЫЛІНСКАЯ.**


*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**8** СНЕЖНЯ 2007 г. СУБОТА

№ 234 (26099)

Кошт 440 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.


# Прэзідэнт Беларусі прыбыў з афіцыйным візітам у Венесуэлу

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыбыў з афіцыйным візітам у Баліварыянскую Рэспубліку Венесуэла.**

Як паведамілі БЕЛТА ў прэсслужбе кіраўніка беларускай дзяржавы, Аляксандр Лукашэнка правядзе перагаворы з венесуэльскім лідарам Уга Чавесам, на якіх, як чакаецца, будзе абмеркаваны ўвесь спектр двухбаковага супрацоўніцтва. Прадугледжваецца падпісанне шэрагу важных сумесных дакументаў.

Аляксандр Лукашэнка плануе таксама прыняць удзел у цырымоніі адкрыцця Нацыянальнай выстаўкі Рэспублікі Беларусь у Венесуэле. Тут будуць прадстаўлены амаль 220 беларускіх экспанентаў. Наведвальнікі выстаўкі змогуць азнаёміцца з інвестыцыйнымі праектамі, дзейнасцю свабодных эканамічных зон, банкаўскім і страхавым сектарамі эканомікі, турыстычнымі магчымасцямі краіны, сістэмай вышэйшай адукацыі ў Беларусі і ўмовамі навучання замежных студэнтаў.

Паміж Беларуссю і Венесуэлай заключана больш як 70 двухбаковых дакументаў, якія складаюць трывалую аснову нарматыўна-прававой базы, падпісаны кантракты на суму каля $650 млн. Бакі пачалі рэалізацыю такіх важных праектаў, як стварэнне сумесных прадпрыемстваў па сейсмаразведцы, здабычы нафты, вытворчасці будматэрыялаў. Пачата пастаўка ў Венесуэлу беларускай аўтамабільнай, сельскагаспадарчай, дарожна-будаўнічай, бытавой тэхнікі, арганізацыі на венесуэльскай тэрыторыі зборачных вытворчасцяў МАЗ, МТЗ, БелАЗ, праектаванне і будаўніцтва жылых раёнаў і пасёлкаў.



Фота БЕЛТА.

Па ўзроўню гаспадарчага развіцця і эканамічнага патэнцыялу Венесуэла традыцыйна ўваходзіць у лік вядучых дзяржаў лацінаамерыканскага рэгіёну. Краіна мае найбагацейшыя запасы нафты, газу, жалезнай руды, вугалю, золата, баксітаў і іншых карысных выкапняў. Вызначальную ролю ў эканоміцы краіны адыгрывае нафтаздабыча і нафтаперапрацоўчая прамысловасць. Паступленні ад нафты складаюць каля 87 працэнтаў усяго аб'ёму венесуэльскага экспарту.

На час, калі вярстаўся нумар, у Каракасе пачаліся перагаворы прэзідэнтаў Беларусі і Венесуэлы Аляксандра Лукашэнкі і Уга Чавеса. Плануецца, што пасля сустрэчы Аляксандр Лукашэнка і Уга Чавес прымуць удзел у цырымоніі адкрыцця Нацыянальнай выстаўкі Рэспублікі Беларусь.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

Фота Генадзя ЖЫНКОВА, БЕЛТА.



**У Венесуэле высока ацэньваюць узровень разведвальных работ беларускіх нафтавікоў**

*У 2008 годзе аб'ём здабычы «чорнага золата» сумесным беларуска-венесуэльскім прадпрыемствам можа скласці каля 1 млн тон. Не выключана, што яшчэ праз год аб'ём здабываемай беларускім бокам венесуэльскай нафты можа павялічыцца да 2 млн тон.*

***НА ЗДЫМКУ:** супрацоўніца венесуэльскай нафтавай кампаніі Умарыліс УВАРЭМА.*

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### ЯШЧЭ ТЫДЗЕНЬ ЦЕПЛЫНІ І ДАЖДЖОЎ

**У гэтыя выхадныя моцны атлантычны цыклон працягне «закідваць» да нас цёплае і вільготнае паветра, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметзабеспячэння Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый Рабаў.**

Праз тэрыторыю Беларусі будуць рухацца актыўныя атмасферныя франты, якія прынясуць да нас дажджы. Раніцай і ўначы магчымы моцны туман. Вецер паўднёвы і паўднёва-заходні 5—10 м/с. Тэмпература паветра ў выхадныя ўначы ад мінус 2 да плюс 4 градусаў, удзень — 0—плюс 6 градусаў. Прыкладна такое надвор'е захаваецца на працягу ўсяго наступнага тыдня.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### МАХЛЯРА ВЯРНУЛІ НА РАДЗІМУ

**29-гадовага беларуса, які вышукваўся Кастрычніцкім РАУС Гродна, экстрадыравалі з-за мяжы ў рэспубліку.**

Паводле даных упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, падазраецца мужчына ў махлярстве: ён, як мяркуецца, злоўжываючы даверам людзей, прысвоіў іх грошы і знік. Расшуквалі яго па лініі Інтэрпола, і, нарэшце, «засвяціўся» гэты беларус на тэрыторыі Германіі. Як высветлілася, мужчына быў асуджаны там да 4 гадоў пазбаўлення волі за вымаганне з прымяненнем насілля і знаходзіўся ў зняволенні. Дарэчы, адбываў пакаранне ён пад імем свайго брата. Нямецкім бокам было прынята рашэнне аб яго экстрадыцыі ў Беларусь для прыцягнення да крымінальнай адказнасці толькі пасля адбыцця часткі пакарання за ўчыненае злачынства ў Германіі.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### ПРЫ СПРОБЕ ЗБЫТУ ДОЗЫ МАРЫХУАНЫ ЗАТРЫМАНА 75-ГАДОВАЯ ЖАНЧЫНА

**У вёсцы Быцель Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці пры спробе збыту дозы марыхуаны затрымана 75-гадовая жанчына. Аб гэтым паведамілі ў аддзеле інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Брэсцкага аблвыканкама.**

У момант затрымання жанчына спрабавала праглынуць наркотык, але ад крымінальнага праследавання гэта не выратавала: у ходзе вобыску ў яе доме знойдзена яшчэ каля сотні такіх доз. Узбуджана крымінальная справа. За гандаль наркотыкамі пенсіянерцы пагражае пазбаўленне волі тэрмінам на 8 гадоў і больш.

**Вольга КАБЯК, БЕЛТА.**

Парламенцкі дзённік

## Савет Рэспублікі адобрыў папраўкі ў закон аб пенсійным забеспячэнні

Як адзначыла на ўчарашнім пасяджэнні верхняй палаты беларускага парламента намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па дэмаграфічнай бяспецы і сацыяльнаму развіццю Ала Ралькевіч, мэта гэтага законапраекта — узгадненне норм закона з палажэннямі ўказа № 726 «Аб вылічэнні сацыяльных выплат». У прыватнасці, у ім прадугледжана, што пры вылічэнні мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце выкарыстоўваецца найбольшая велічыня бюджэту пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва за два апошнія кварталы. Акрамя таго, пры пераразліку мінімальных памераў пенсій, сацыяльных пенсій, надбавак да іх і павышэнняў прапануецца ўлічваць змяненні мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце.

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі адобрыў папраўкі ў некаторыя законы па пытаннях незаконнага абароту наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў і іх прэкурсораў.

Як адзначыў старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы верхняй палаты беларускага парламента Мікалай Чаргінец, законапраект прадугледжвае дапаўненне шэрагу артыкулаў Крымінальнага кодэкса кваліфікуючай прыметай адносна асабліва небяспечных наркатычных сродкаў або псіхатропных рэчываў. Гэта дасць магчымасць вызначаць тэрмін пакарання не толькі ў залежнасці ад колькасці наркотыку, які знаходзіцца ў незаконным абароце, як гэта робіцца цяпер, але і ад яго віду.

Акрамя таго, улічваючы расліннае паходжанне некаторых наркотыкаў, у Крымінальны кодэкс і ў Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях уносяцца дапаўненні і змяненні, якія ўстанаўліваюць адказнасць за сяўбу і вырошчванне грыбоў, што змяшчаюць наркатычныя сродкі і псіхатропныя рэчывы. Адпаведныя папраўкі ўносяцца і ў закон Беларусі «Аб наркатычных сродках, псіхатропных рэчывах і іх прэкурсорах».

Савет Рэспублікі таксама адобрыў ратыфікацыю міжурадавага беларуска-італьянскага дагавора аб умовах аздараўлення на аснове бязвыплатнай дапамогі непаўналетніх грамадзян Беларусі. Гэты дакумент быў падпісаны ў маі гэтага года ў Мінску. Ён накіраваны на стварэнне дадатковых магчымасцяў і гарантый сацыяльнай абароны беларускіх дзяцей у час іх знаходжання на аздараўленні ў Італіі, а таксама на своечасовае вяртанне іх на радзіму. Дагавор быў вельмі неабходны, паколькі ў Італіі аздараўліваецца найбольшая колькасць беларускіх дзяцей. Гэта краіна зарэкамендавала сябе адным з надзейных партнёраў Беларусі ў гэтым пытанні.

У адпаведнасці з дагаворам на аздараўленне будуць накіроўвацца дзеці са школ-інтэрнатаў, якія пражываюць на тэрыторыях, пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС, з няўдалых сем'яў, а таксама дзеці, якія маюць сур'ёзныя праблемы са здароўем. Расходы па іх праездзе, страхаванні, знаходжанні нясе італьянскі бок. У дакуменце таксама замацаваны патрабаванні да правілаў знаходжання беларускіх дзяцей і агаворваецца, што пасля завяршэння аздараўлення яны будуць абавязкова вернуты на радзіму.

**Кар. БЕЛТА.**

## У Беларусі абвяргаюць інфармацыю аб намеры Аляксандра Лукашэнкі і Уладзіміра Пуціна падпісаць дакумент аб размеркаванні паўнамоцтваў у СД

**У Беларусі абвяргаюць інфармацыю расійскіх СМІ аб тым, што Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін у бліжэйшы час падпішуць у Мінску Канстытуцыйны акт і размяркуюць паўнамоцтвы ў Саюзнай дзяржаве.**

«У Беларусі са здзіўленнем успрынялі гэту «інфармацыю», якая ўзялася немаведама адкуль. І таму што яна з'явілася ў расійскіх СМІ, за каментарыямі рэкамендую звяртацца да расійскага боку», — сказаў у гутарцы з карэспандэнтам БЕЛТА кіраўнік прэс-службы Прэзідэнта Беларусі Павел Лёгкі. «Мы яе абвяргаем», — дадаў ён.

У зацверджаным парадку дня маючага адбыцца пасяджэння Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы асобнае пытанне аб праекце Канстытуцыйнага акта і ходзе яго падрыхтоўкі адсутнічае. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА заявіў выконваючы абавязкі кіраўніка прадстаўніцтва Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы ў Мінску Анатоль Камісарчук.

Паводле яго слоў, на пасяджэнні ВДС у Мінску плануецца разгледзець 12 пытанняў, галоўным з якіх будзе саюзны бюджэт-2008. Ён будзе прыкладна на 10 працэнтаў большы, чым у 2007 годзе, і перасягне 4 млрд расійскіх рублёў.

Акрамя таго, будуць падведзены вынікі гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва Беларусі і Расіі за 2006 год і першае паўгоддзе 2007 года, адзначыў Анатоль Камісарчук. ВДС таксама разгледзіць ход выканання праграмы ўзгодненых дзеянняў у галіне знешняй палітыкі на 2006—2007 гады, пытанне аб прысуджэнні прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва за 2007—2008 гады і шэраг іншых пытанняў.

## ААТ «АСБ БЕЛАРУСБАНК» УШАНАВАЎ ЛЕПШЫХ КЛІЕНТАЎ-2007

**У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылося ўзнагароджанне кліентаў-пераможцаў ААТ «АСБ Беларусбанк» па выніках работы 2007 года.**

Старшыня Праўлення ААТ «АСБ Беларусбанк» Надзея ЕРМАКОВА нагадала на адкрыцці цырымоніі, што ўрачыстая сустрэча наладжана напярэдадні 85-годдзя з дня ўтварэння банка, а таксама зазначыла, што, па вялікім рахунку, усе банкаўскія кліенты, а гэта 77 тысяч прадпрыемстваў і арганізацый розных формаў уласнасці, або 20 працэнтаў усіх юрыдычных асобаў — бясспрэчныя пераможцы ў сваёй справе.

Тым не менш у намінацыях «За спажыванне найбольшага спектра паслуг», «За доўгачасовае і плённае супрацоўніцтва», «За актыўнасць у развіцці новых формаў супрацоўніцтва», «За паспяховую рэалізацыю сумеснага праекта», За супрацоўніцтва ў развіцці малога бізнэсу» былі прадстаўлены 120 прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў краіны. Разам з ААТ «Палімір», ААТ «Нафтан», РУВП «Віцязь», РУП «Гомсельмаш», ААТ «Белтрансгаз», РУП «Белтэлекам» і іншымі, адначасова з Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі, Беларускім дзяржаўным тэхнічным універсітэтам, Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэтам, Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэтам, Акадэміяй упраўлення пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь і іншымі ў намінацыі «За доўгачасовае і плённае супрацоўніцтва» былі прадстаўлены і сродкі масавай інфармацыі — ЗАТ «Сталічнае тэлебачанне», ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал», Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія Рэспублікі Беларусь, уласна газеты «Звязда», «Советская Белоруссия», «Народная газета»...

Варта нагадаць, што ААТ «АСБ Беларусбанк» з'яўляецца найбуйнейшым крэдыторам беларускай эканомікі: яго крэдытны партфель складае 13,3 трлн рублёў, прычым за апошнія сем гадоў ён павялічыўся ў 20 разоў. Сёння банк прапануе сваім клієнтам звыш 120 відаў паслуг: ад стандартных па разлікова-касаваму абслугоўванню да шматлікіх паслуг міжнароднага ўзроўню. Выкарыстанне сучасных тэхналогій дазваляе ажыццяўляць аддаленае кіраванне рахункамі з дапамогай сістэмы «Кліент-банк». З дапамогай электроннай сістэмы плацяжы ажыццяўляюць каля 6 тысяч кліентаў. Каля 15 тысяч прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў знаходзяцца ў банку на абслугоўванні па выдачы заработнай платы з выкарыстаннем банкаўскіх пластыкавых картак.



Фота БЕЛТА.

На працягу гэтага года банк прыцягнуў 2 сіндыкаваныя крэдыты ў агульным аб'ёме 143 млн долараў ЗША. У наступным годзе плануецца не толькі нарошчваць прамыя і сіндыкаваныя крэдыты, але і ажыццявіць дэбютны выпуск еўрааблігацый у суме не менш за 200 млн долараў ЗША.

ААТ «АСБ Беларусбанк» актыўна ўдзельнічае ў рэалізацыі дзяржаўных інвестыцыйных праграм, скіраваных на будаўніцтва, мадэрнізацыю, тэхнічнае пераўзбраенне вытворчасцяў і ўдасканаленне тэхналагічных працэсаў, асноўнымі з якіх з'яўляюцца Рэспубліканская праграма аснашчэння сельскагаспадарчай вытворчасці сучаснай айчыннай тэхнікай, праграмы развіцця цукровай і мяса-малочнай прамысловасці, праграмы развіцця малых гарадоў.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

### Увага: «прамая лінія»!

### ПРЫГОЖАЕ ДАЎГАЛЕЦЦЕ

«Прамая лінія» з удзелам загадчыка кафедры клінічнай фармакалогіі і тэрапіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, доктарам медыцынскіх навук, прафесарам Аляксандрам Васільевічам ХАПАЛЮКОМ адбудзецца ў рэдакцыі газеты **14 снежня з 14.00 да 15.30** па нумарах: **292 38 92 і 292 38 21.**

Для папярэдніх пытанняў: **287 18 29 (Святлана Барысенка) і 287 18 36 (Вольга Шаўко).**


**ОАО «Паритетбанк» (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

**ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже 3-этажного кирпичного здания пристройки к административно-бытовому комплексу (общ. пл. 2038 кв.м, пл. зем. уч. 0,3611 га) и здания проходной (общ. пл. 10 кв.м, пл. зем. уч. 0,0049 га), расположенных: Смолевичский р-н, д. Будагово. Начальная цена 780 000 000 бел. руб с НДС. Задаток в размере 5% от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней с даты проведения аукциона. Объекты продаются без условий. Договор аренды земельных участков будет перезаключен по решению Смолевичского райисполкома. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 08.01.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 04.01.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактный телефон (8017) 2246134.**
**Сайт в Интернете: www.rlt.by**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.*

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

**ПРОВОДИТ АУКЦИОННЫЕ ТОРГИ ПО ПРОДАЖЕ:**

- 3-этажного кирпичного здания пристройки к АБК (2038 кв.м, пл. зем. уч. 0,3611 га) и здания проходной (10 кв.м, пл. зем. уч. 0,0049 га) в д. Будагово Смолевичского р-на;
- 8 земельных участков для строительства и обслуживания жилого дома в г.п. Свислочь Пуховичского р-на;
- гаража № 184 (41, 8 кв.м) в ГСК «Фортуна плюс», г. Минск, ул. Ф. Скорины, 50а;
- комплекса зданий по адресу: г. Марьина Горка, ул. Восточная, 8: склад (258, 6 кв.м), склад ГСМ (15, 2 кв.м), баня (805, 6 кв.м), гараж (254, 9 кв.м), проходная (14,4 кв.м), прачечная (871,9 кв.м), ж/б забор (498 п.м), коммуникации. Пл. зем. уч. 1,1543 га;
- зданий Томковичской средней школы: 501 кв.м, 302,1 кв.м, 173,6 кв.м и 217,0 кв.м по адресу: Дзержинский р-н, д. Томковичи. Пл. зем. уч. 1,6666 га;
- здания склада (463,4 кв.м, железнодорожная ветка), расположенного: Пуховичский р-н, г.п. Руденск, ул. Железнодорожная, 3. Пл. зем. уч. 0,0723 га;
- завода картофелепродуктов в г. Узде в составе: зданий модуля — Орск (875 кв.м), склада (232,6 кв.м), котельной (306, 4 кв.м), склада (234,4 кв.м), спиртохранилища (131,4 кв.м), цеха картофелепродуктов (1856, 4 кв.м) и др. Пл. зем. уч. 5, 11 га;
- здания столовой (841,0 кв.м) и склада (143,1 кв.м), расположенных: г. Жодино, ул. 40 лет Октября, 5.

**Контактный телефон (8017) 224 61 34.**
**Сайт в Интернете: www.rlt.by**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015*


## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### НЬЮ-ЙОРКСКІМ ЯЎРЭЯМ ПРАПАНАВАЛІ АДСВЯТКАВАЦЬ ХАНУКУ СВІНІНАЙ




**Нью-Йоркская крама далікатэсаў абвясціла спецыяльную акцыю па распродажы свініны для іудзеяў. Слоганам спецмерапрыемства стала фраза «смачняціна для ханукі», рэлігійнага іудзейскага свята.**

Канфуз заўважыла адна з блогераў, якая сфатаграфавала вітрыну і фота выклала ў Інтэрнэт. Праз некалькі дзён «рапродаж свініны для яўрэяў» скончыўся. Адміністратар крамы заявіў, што таблічка на аддзеле са свінінай з'явілася выпадкова і абвінаваціў у гэтым аднаго з работнікаў склада.

### АЎСТРАЛІЙЦЫ ПАЛІЧЫЛІ ПРЫВІТАННЕ САНТА-КЛАЎСА АБРАЗЛІВЫМ ДЛЯ ЖАНЧЫН



**Кіраўніцтва крамы ў аўстралійскім горадзе Кернс звольніла штатнага Санта-Клаўса за традыцыйнае «Хо-хо-хо», якім ён вітаў наведвальнікаў. Як піша The Daily Telegraph, Санту было забаронена гаварыць гэтае словаспалучэнне, паколькі слова «ho» на жаргоне абазначае жанчыну лёгкіх паводзінаў, і паліткарэктныя работадаўцы вырашылі, што падобны зварот можа абразіць наведвальніц.**

70-гадовы Джон Оукс, які адпрацаваў Санта-Клаўсам 10 гадоў, сцвярджае, што яму загадалі замяніць «хо-хо-хо» на «ха-ха-ха», а ён лічыць, што падобнае новаўвядзенне «знішчае дух Ражджаства». Акрамя таго, Санта спяваў песеньку «Jingle Bells», што яму таксама было забаронена.

### КАТАЛІЦКІ СВЯТАР АСУДЖАНЫ ЗА КРАДЗЕЖ $1,3 МЛН З КАСЫ ПРЫХОДА

**Яго прыпадобіе каталіцкі святар Майкл Джуд Фэй з царквы Святога Іаана Хрысціцеля епархіі Брыджпорт пад Нью-Йоркам асуджаны да трох гадоў і аднаго месяца турмы за крадзеж 1,3 мільёна долараў з касы свайго прыхода, піша The New York Times.**

Як высветліла следства, айцец Фэй траціў царкоўныя грошы на прадметы раскошы, дарагія пабракушкі, акрамя таго, набыў дом з зямлёй на беразе ракі. З улікам памераў выкрадзенага і абставінаў крадзяжу суддзя назвала злачынствы Фэя «пачварнымі».

### КАМЧАЦКІ МЯДЗВЕДЗЬ ПАДПІЛЬНАВАЎ І З'ЕЎ ПЕНСІЯНЕРА



**На Камчатцы ў раёне населенага пункта Жупанава мядзведзь-людаед напаў на пенсіянера.**

Як расказаў начальнік аддзела экалагічнага кантролю Краноцкага запаведніка Цімафей Дахно, інцыдэнт адбыўся на рачной касе, дзе пажылы мужчына выгульваў сабаку. Спачатку мядзведзь злавіў і задраў сабаку, а затым падпільнаваў пенсіянера і забіў яго. Мядзведзя-забойцу застрэлілі паляўнічыя.

**Чытайце толькі на старонках «Звязды»**

## ГАЗЕТНЫ СЕРЫЯЛ «ЖАНАЦІКІ»



*Вось так, спадарства, дагуляўся... Адступаць няма куды, за намі, як заўсёды — самі ведаеце што. Згубілі маладога саколіка. Бывай, вольнае жыццё і ўсё, што з ім звязана. Бывайце вячоркі да раніцы. Даруйце мне, калі зможаце, паненкі мае. Парвіце ўсе фатаздымкі, пакіньце ў сметніку падарункі і выкрасліце назаўжды нумар майго тэлефона. Больш вам ніхто па ім не адкажа. А калі і адкажа, то пашкадуеце, што патэлефанавалі. Да пабачэння, мой лепшы сябра, зараз ты будзеш хадзіць у нашую кавярню ўжо без мяне. Бывай, мая любімая камп'ютарная стралялка, не крыўдуй, што выдаліў цябе, вось толькі што, нават не дагуляўшы трыццаць сёмы ўзровень... Добра, што не набыў новы тэлевізар, — усё роўна глядзець свае любімыя праграмы не давядзецца. А Інтэрнэт з забаўляльнымі сайтамі ўжо заблакіраваны.*

*(Працяглы стогн нявыказанага адчаю секунд дзесяць). І на каго ж я вас пакідаю, даражэнькія мае?!*


***(Заканчэнне на 4-й стар.)***



ISSN 1990 - 763X

07234>

9771990763008


**КУРСЫ ВАЛЮТ**

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 08.12.2007 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 154,00 |
| 1 еўра | 3 149,47 |
| 1 латвійскі лат | 4 511,47 |
| 1 літоўскі літ | 912,13 |
| 1 чэшская крона | 120,40 |
| 1 польскі злоты | 879,15 |
| 1 расійскі рубель | 87,81 |
| 1 украінская грыўня | 425,27 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 24,5295 |
| 10 UAH | 48,3817 |
| 1000 BYR | 11,3727 |
| EUR | 35,8327 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 07.12.2007 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова


*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

Краіна здароўя

Выпуск № 40 (53)

# ДЗІЦЯЧЫЯ ІНФЕКЦЫІ: ЗНАЙСЦІ І АБЯСШКОДЗІЦЬ

**На пытанні чытачоў адказвае загадчык кафедры дзіцячых інфекцыйных хваробаў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, дацэнт, галоўны пазаштатны дзіцячы інфекцыяніст Міністэрства аховы здароўя Іна ГЕРМАНЕНКА.**

**(Працяг. Пачатак у нумары за 6 снежня.)**

***☎ — З Клецка турбуе Ганна Мікалаеўна. Ці існуюць проціпаказанні для прышчэпкі ад грыпу дзецям?***

— Вельмі асцярожна гэтыя прышчэпкі трэба рэкамендаваць дзецям-алергікам, у якіх у анамнезе была алергічная рэакцыя на курынае яйка і мяса. Бо шэраг вакцын вырабляецца на курыных эмбрыёнах. А ўвогуле абсалютных проціпаказанняў да правядзення вакцынацыі супраць грыпу няма. Адзінае, дзіця на момант вакцынацыі павінна быць здаровым.

***☎ — Вольга з Ліды. Калі сёлета чакаецца найбольшы ўздым захваральнасці на грып сярод дзяцей?***

— Не толькі аб грыпе трэба казаць. На працягу ўсяго халоднага перыяду рэгіструюцца розныя рэспіраторныя інфекцыі і некаторыя з іх такія ж небяспечныя для дзяцей, як і грып. Яны пачынаюць прыходзіць, як правіла, з канца верасня і доўжацца да наступлення цяпла. А пад'ём захваральнасці на грып мы чакаем у канцы студзеня—лютым.

***☎ — Гомель. Ля тэлефона Нэла Іванаўна. Скажыце, ці можа дыятэз быць звязаны з інфекцыяй?***

— Дыятэз ці атапічны дэрматыт у дзяцей можа праяўляцца часам пры з'явах дысбактэрыёзу, г.зн. сіндрому залішняга ці недастатковага росту мікрафлоры кішэчніка. Пры гэтым парушаецца ўсмоктванне і расшчапленне цэлага шэрагу харчовых рэчываў, якія трапляюць у страўнікава-кішачны тракт. Гэта можа абумоўліваць узмацненне такой алергічнай рэакцыі, як дыятэз.

***☎ — Аляксандра Пятроўна звоніць з Бабруйска. У пачатку навучальнага года, калі фарміруюцца дзіцячыя калектывы, — у школах, дзіцячых садках, хлопчыкі і дзяўчынкі пачынаюць хварэць, заражаючыся адно ад аднаго. Ці можна неяк знізіць рызыку заражэння, што ў гэтым плане павінны ведаць бацькі?***

— Рыхтуючы дзіця да наведвання дзіцячага калектыву, бацькі павінны рабіць гэта правільна. Неабходна малога загартоўваць: прымаць водныя і паветраныя працэдуры, хадзіць басанож, часцей праветрываць жылое памяшканне, не хутаць яго вельмі моцна перад выхадам на вуліцу. Неабходна навучыць дзіця насавому дыханню.

У першыя дні, калі толькі пачынаецца наведванне садка, можна выкарыстоўваць медыкаментозную прафілактыку. Яна ўключае прамыванне носа растворамі натрыю хларыду, саліну, гумеру ці 1-працэнтным растворам соды і солі. Мажце насавыя хады спецыяльнымі мазямі (бораментол, эвамeнтол, аксалін), каб абараніць слізістую. У рацыёне дзіцяці павінна быць шмат вітамінізаванай ежы і не толькі з дабаўкамі штучных лекавых прэпаратаў, прывучайце дзіця да цыбулі, часнаку. Рэкамендуюцца салаты з цыбулі з аскарбінкай, у ежу дадавайце часночную пасту, часночныя пацеркі таксама на карысць. Паменш чыпсаў, сухіх сняданкаў, сухамяткі.

***☎ — З Клецка Наталля Уладзіміраўна турбуе. Маёй дзяўчынцы — 10 гадоў. Кожны месяц прастуджваецца і на губах з'яўляецца герпес. Як з ім змагацца?***

— З гэтым абавязкова трэба звярнуцца да ўчастковага ўрача. Акрамя таго, дзіця трэба даследаваць імуналагічна. Гэтыя хваробы нярэдка імуназалежныя. Бо калі сістэме імунітэту не хапае нейкіх фактараў, то як бы мы ні лячылі герпес, ён усё роўна будзе даваць рэцыдыў. Даследаванне трэба пачаць з агульнага аналізу крыві, калі спатрэбіцца, зрабіць імунаграму. Па выніках доктар прызначыць вам лячэнне. Цяпер для лячэння герпесу ёсць спецыяльныя прэпараты.

***☎ — Добры дзень! Званю з Глыбоцкага раёна, завуць Алена. Дзіцяці — 2 гады 11 месяцаў. Часта хварэе. Скажыце, як прафілактаваць прастудныя захворванні? Якой можа быць першая дапамога?***

— А дзіця наведвае садок?

***— Так.***

— І з пачаткам наведвання садка часцей пачало хварэць?

***— Так.***

— Калі дзіця бясконца хварэе, неабходна даследаваць імунны статус, ці здольны той да абароны ад хвароб. У перыяд адаптацыі дзіцяці да садка можа назірацца актывізацыя захваральнасці — да 6—8 разоў на год. Але такія станы працякаюць без ускладненняў і не патрабуюць ужывання антыбіётыкаў. Аднак калі дзіця хварэе часцей і гэта патрабуе прымянення лекавых сродкаў, значыць, трэба па-першае, зрабіць імунаграму, а па-другое, паглядзець, у якім акружэнні яно выхоўваецца, наколькі здаровыя яго бацькі і іншыя сваякі. Таму што нярэдка вірусная інфекцыя, мікробы перадаюцца ад бліжэйшага дарослага акружэння — тых, з кім дзіця пражывае. Ва ўсіх гэтых дарослых насаглотка павінна быць у парадку. Раю вам трапіць на прыём да імунолага і лор-урача.

***— Вы маглі б параіць нам якія-небудзь прэпараты?***

— Па тэлефоне, вядома ж, не, паколькі гэтыя лекі часта даюць алергічныя праяўленні. Самы просты сродак — выкарыстанне фізіялагічных раствораў накшталт натрыю хларыду або 1-працэнтнага раствору солі і соды. Калі ёсць гнойныя выдзяленні, можна капаць прэпарат ізофра, сок каланхоэ, алоэ, разбаўленыя 1:1 з гатаванай вадой. Зноў жа, калі ў дзіцяці няма алергічных праяў. Памятайце, што нельга пастаянна апрацоўваць горла разнастайнымі прэпаратамі. Лепш за ўсё — даваць цёплае піццё, напрыклад, малако, мінеральную ваду «Баржомі», «Нарзан», «Славянаўская», «Смірноўская». Можна піць цёплыя морсы — журавінавы, парэчкавы. Для ўмацавання імуннай сістэмы можна выкарыстоўваць інтэрферон ці прэпараты інтэрферону — анаферон дзіцячы, гропрынасін, свечкі кіпферон, прэпараты арбідол, цыклаферон. А мясцова для носа — лейкацытарны інтэрферон, які разводзіцца вадой і капаецца для прафілактыкі, і грыпферон, які рэдка, праўда, сустракаецца ў нашых аптэках.

***☎ — Мінск, Іна Іванаўна. Дзіцяці — 15 гадоў. Пастаянная тэмпература ўжо другі год, лейкацыты — 3,1. Гематолагі кажуць, што мае быць лейкапенія інфекцыйнага паходжання. Рабілі аналіз крыві на ВЭБ-інфекцыю, выявілі антыцелы, але лячэння ніякага не прызначалі. Але ж павялічана печань, ёсць галаўны боль... Што нам рабіць?***

— Толькі адно вызначэнне антыцелаў да віруса Эпштэйн-Бара не гаворыць аб тым, наколькі актыўнай з'яўляецца інфекцыя на дадзены момант. На жаль, ВЭБ-інфекцыя ў апошні час часта пераходзіць у хранічную форму.

***— Мне сказалі, што лячэння ніякага няма. Калі ёсць антыцелы, хвораму не патрэбна ні тэрапія інтэрферонам, ні якая іншая...***

— Не так адназначна. Калі ёсць клініка — уздым тэмпературы, павялічаная печань, лейкапенія захоўваецца, то тут трэба глядзець. На сённяў дзіцячай інфекцыйнай бальніцы ёсць магчымасць вывучаць, ці ёсць цыркуляцыя віруса ДНК на дадзены момант. Калі ёсць, тады ўзнімаецца пытанне аб лячэнні. А лячэнне інтэрферонамі, акрамя карысці, мае і шэраг пабочных эфектаў.

***— Якімі павінны быць мае цяперашнія дзеянні?***

— Вы да якой паліклінікі адносіцеся?

***— Да 17-й.***

— У вас добры інфекцыяніст, бярыце ў яго накіраванне і прыязджайце на шпіталізацыю ў дзіцячую інфекцыйную бальніцу. Амбулаторна абследавацца не атрымаецца, паколькі спатрэбіцца даследаваць цэлы шэраг параметраў у дынаміцы.

***☎ — Ашмяны, Алена Мікалаеўна. Дзіцяці — 17 гадоў. Гадоў 7 у яго ўзнікаюць герпесныя высыпкі на губах, пасля — і на вачах. Паставілі дыягназ — кератыт. Перыядычна захворванне абвастраецца. Як бы нам абследавацца?***

— Вам не толькі трэба абследавацца, але і лячыцца, паколькі ўжо ёсць клінічныя праяўленні. У вас, напэўна, ёсць інфекцыяніст у раённай бальніцы...

***— Сын вучыцца ў Мінску.***

— Студэнты абслугоўваюцца ў студэнцкай паліклініцы № 33. Можна звярнуцца да тамтэйшага інфекцыяніста ці тэрапеўта. А можна адразу звярнуцца ў інфекцыйную дарослую бальніцу на вуліцы Крапоткіна, дзе працуе кансультацыйны дыспансэрны кабінет. Там і пракансультуюць, і прызначаць лячэнне. Герпес вока — небяспечная форма. Так што трэба абавязкова лячыцца. Для гэтага ёсць сродкі этыятропнай тэрапіі, у прыватнасці, ацыклавір, які спыняе бясконцае размнажэнне віруса. Магчыма, варта зрабіць і імунаграму, каб пераканацца ў тым, ці ёсць імуназалежнае захворванне.

**Святлана БАРЫСЕНКА, Вольга ШАЎКО.**

***(Працяг будзе.)***

## Непагадзь — каталізатар прастуды

**Паводле інфармацыі Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, за апошні тыдзень (з 26 лістапада па 2 снежня) з сімптомамі прастуды і грыпу ў медыцынскія ўстановы кантрольных гарадоў звярнуліся 50 036 чалавек, што на 6,7 працэнта перавышае аналагічны паказчык за папярэдні тыдзень. У Баранавічах і Мінску, дзе на мінулым тыдні было адзначана аднадзённае перавышэнне эпідэмічнага парога, захваральнасць на вострыя рэспіраторныя вірусныя інфекцыі і грып зноў знізілася да неэпідэмічнага ўзроўню.**

Паводле слоў спецыялістаў, аднадзённае перавышэнне эпідпарога — яшчэ не падстава для хвалявання. Да таго ж вірусы грыпу пакуль яшчэ не дамінуюць у «вірусным пейзажы». Паводле даных Нацыянальнага цэнтра па грыпу, сёння на тэрыторыі Беларусі «ўладарыць» адэнавірусная інфекцыя (39,3 працэнта ад агульнай колькасці выдзеленых узбуджальнікаў) і РС-інфекцыя (23,1 працэнта). Больш за тое, пакуль што ніводная краіна на еўрапейскім кантыненце не паведаміла аб стабільным перавышэнні эпідпарога. У многіх краінах адзначана толькі спарадычная захваральнасць на грып. Лакальныя ўспышкі грыпу былі зарэгістраваныя таксама ў ЗША і Канадзе. Але інтэнсіўнасць эпідпрацэсу будзе паступова нарастаць, таму самы час паклапаціцца аб процігрыпознай прышчэпцы.

У Беларусі на пачатак гэтага тыдня было прышчэплена супраць грыпу 397 403 чалавекі (101 706 дзяцей і 295 697 дарослых). За кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту прышчэплены 370 803 чалавекі, з іх 100 825 дзяцей і 295 697 дарослых. Нагадаем, што для бясплатнай вакцынацыі асобаў з групы рызыкі сёлета было закуплена каля 900 тысяч доз вакцыны, таму тэмпы вакцынацыі Міністэрства аховы здароўя не зусім задавальняюць. Галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Беларусі Міхаіл Рымжа звярнуўся да насельніцтва з заклікам больш актыўна праходзіць імунізацыю супраць грыпу.

У Мінску вакцынацыю супраць грыпу асобаў з групы рызыкі плануюць завяршыць да канца гэтага тыдня. Усяго ў сталіцы планавалася бясплатна прышчапіць 70—80 тысяч дарослых і каля 20 тысяч дзяцей. На канец лістапада прапанаванай магчымасцю скарысталіся каля 13 тысяч дзяцей і больш як 55 тысяч дарослых.

За кошт уласных сродкаў вакцынацыю прайшлі больш як 6 тысяч мінчан. На платнай аснове прышчэпкі ў сталіцы можна зрабіць ва ўсіх дарослых паліклініках і на базе гарадской дзіцячай інфекцыйнай бальніцы. Платную вакцынацыю супраць грыпу прапануюць таксама тры недзяржаўныя медыцынскія цэнтры: «Нардзін», «Экамедсэрвіс» і «Ладэ».

За кошт сродкаў арганізацый былі прышчэплены 14 тысяч чалавек. Найбольш актыўна арганізавалі вакцынацыю сваіх работнікаў прадпрыемствы «Атлант», «Гарызонт», Мінскі трактарны завод, ААТ «Аграсэрвіс» (Заходні рынак), аўтапарк № 1, «Міжнародны Дзелавы Альянс», рэстаран «Лідо» і іншыя. У Мінскім гарадскім цэнтры гігіены і эпідэміялогіі сцвярджаюць, што ўкладанне сродкаў у вакцынацыю працоўнага калектыву цалкам апраўдвае сябе падчас эпідэміі грыпу за кошт скарачэння перыяду непрацаздольнасці работнікаў. Навуковыя даследаванні, праведзеныя ў розных краінах свету, паказалі, што эканамічны эфект ад вакцынацыі супраць грыпу ў 6—9 разоў перавышае выдаткі на правядзенне прышчэпак. Звычайна імунітэт пачынае фарміравацца ўжо праз адзін-два тыдні пасля прышчэпкі. А паколькі эпідэміёлагі прагназуюць прыход эпідэміі грыпу на тэрыторыю Беларусі не раней чым у студзені, у нас яшчэ застаецца час, каб грунтоўна падрыхтавацца да сустрэчы з грыпам...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Доктар адкажа

### ЁСЦЬ ПЫТАННІ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ...

На будучым тыдні дзяжурыць на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (2227080) плануюць:

**10 снежня** — галоўны ўрач 30-й мінскай гарадской паліклінікі Людміла Іванаўна ЦЯРЭНЦЬЕВА.

**11 снежня** — галоўны ўрач 15-й дзіцячай сталічнай паліклінікі Людміла Іванаўна БАРАНЧЫКАВА.

**12 снежня** — галоўны ўрач 26-й мінскай гарадской паліклінікі Уладзімір Міхайлавіч ЖЫЛЕВІЧ.

**13 снежня** — галоўны ўрач 3-й сталічнай дзіцячай клінічнай бальніцы Людміла Пятроўна КАЗАЧКОВА.

**14 снежня** — галоўны ўрач 10-й сталічнай клінічнай бальніцы Аляксандр Васільевіч БАЛАКІРАЎ.

У графіку магчымыя змяненні.

## ХАВАЙСЯ АД НАЧНОЙ РАБОТЫ

**Работа ў начныя змены — парушэнне ўсіх магчымых біялагічных і фізіялагічных «рэжымаў». Ёсць меркаванне, што гэта нават прыводзіць да развіцця пухлінаў.**

Даследчыкі некалькіх краін свету мяркуюць, што начныя работнікі (часцей у галінах аховы здароўя, прамысловасці, транспарту, сувязі, гасцінічнага бізнэсу і г.д.) маюць павялічаную рызыку развіцця раку. Гэта тлумачыцца парушэннем рэжыму сну і адпачынку. Аднак нельга забывацца і на іншыя шматлікія фактары, якія спрыяюць анкалагічным працэсам — курэнне, злоўжыванне алкаголем, генетычная схільнасць, у цэлым нездаровы лад жыцця, неэфектыўнае лячэнне старых хваробаў, шкоднае ўздзеянне навакольнага асяроддзя.

## Паляўнічае шчасце



Фота Васіля ЗЯНЬКО.

**Пароша для паляўнічага нібы святочны абрус: кожны слядок на ім што пячатка. Вось роўненькі ланцужок слядкоў на дарозе. Гэта на пошук здабычы выйшла жоўта-чырвоная прыгажуня — ліса. Там-сям спрабавала разграбаць сняжок пад кустамі ядлоўцу — трывожыў пах мышыных хадоў.**

А вось свой след пакінуў вушасцік. Скок ды скок — узяў кірунак на жытнёвы палетак, а затым на старое хутарышча, дзе нібы прывід стаяць пачарнелыя ад макраты яблыні. Можа тут зайчык знойдзе сакаўны пачастунак — яблыкі «антонаўкі», якія дагэтуль там-сям трымаюцца на галінах. У разоры ля каменных муроў у яго будзе і дзённая лёжка-схованка ў высокай рыжай траве. Глядзі яшчэ і сняжок прыцярушыць, прыкрые.

Разбіраць, разблытваць сляды, хады і скідкі, адчуваць яднанне з прыродай — што можа быць больш цікавым і здаровым. Здаецца, находзішся, навалтузішся, «наб'еш» ногі, а на душы — асалода. А яшчэ калі трапны стрэл! Ён як узнагарода. Вось яна, непрыкрытая радасць паляўнічага шчасця, якое падарыла прырода на Стаўбцоўшчыне Сяргею Паляшуку і Яўгену Камарову, а таксама іх чатырохногім памочнікам-ганчакам.

## ЧАМУ КАТАРАКТА «МАЛАДЗЕЕ»?

**«У апошнія гады тэхнічная аснашчанасць рэспубліканскай афтальмалагічнай службы істотна палепшылася, — такую думку выказаў на прайшоўшым у Мінску VII з'ездзе афтальмолагаў намеснік міністра аховы здароўя нашай краіны Віктар РУДЭНКА. — Магчыма, сёння мы вяртаем афтальмалагічнай службе старыя даўгі, і многае з таго, што робіцца сёння, трэба было зрабіць раней, тым не менш Міністэрства аховы здароўя плануе ажыццявіць у бліжэйшы час сур'ёзныя фінансавыя ўліванні для ўкаранення ў дзяржаўных установах аховы здароўя самых прагрэсіўных медыцынскіх тэхналогій у дыягностыцы і лячэнні захворванняў зроку».**

Зусім нядаўна завяршылася рэканструкцыя афтальмалагічнага корпуса 3-й сталічнай клінічнай бальніцы, дзе размясціліся два афтальмалагічныя аддзяленні, аддзяленне лазернай мікрахірургіі вока і дыягнастычны цэнтр. Плюс афтальмолагі атрымалі самае сучаснае абсталяванне: 4 аперацыйныя мікраскопы, ультрагукавы факаэмульсіфікатар «Універсал», два апараты для факаэмульсіфікацыі катаракты па метаду АКВАЛАЙЗ (з дапамогай магутнага струменю вады), эндалазер, трохмерны ўльтрагукавы сканер, афтальмалагічныя лазеры для аперацый на сятчатцы і г.д. Самае сучаснае афтальмалагічнае абсталяванне атрымаў нядаўна і Рэспубліканскі цэнтр мікрахірургіі вока, размешчаны на базе 10-й сталічнай клінічнай бальніцы.

Варта заўважыць, што апошні раз беларускія афтальмолагі збіраліся на з'ездзе 11 гадоў таму, і за гэты час у свеце з'явіліся сучасныя спосабы дыягностыкі зрокавай паталогіі і высокатэхналагічныя метады хірургічнага лячэння блізарукасці, катаракты, глаўкомы, адслойкі сятчаткі, траўмаў органаў зроку і г.д. Да нядаўняга часу многія з сучасных метадаў лячэння паталогіі зроку былі даступныя толькі пацыентам недзяржаўных медыцынскіх устаноў. Але сітуацыя пакрысе выпраўляецца...

Адным з самых распаўсюджаных і складаных захворванняў з'яўляецца катаракта. Гэтай праблеме прысвячаюцца штогадовыя міжнародныя сімпозіўмы і канферэнцыі. Пры катаракце хрусталік пад уздзеяннем розных фактараў становіцца мутным, а выявы ўсіх прадметаў — размытымі і невыразнымі. Доўгі час катаракта лічылася хваробай старэчага ўзросту, ад якой практычна нельга застрахавацца. Аднак афтальмалагічная практыка апошняга дзесяцігоддзя сведчыць аб тым, што ўсё часцей парушэнні празрыстасці хрусталіка выяўляюцца ў людзей 35—40-гадовага ўзросту. Магчыма, гэта адно з наступстваў пастаянных нервова-псіхалагічных перагрузак і каласальнай зрокавай нагрузкі на сучаснага чалавека ці ўздзеяння шкодных звычак і неспрыяльнай экалагічнай абстаноўкі? Аднак факт застаецца фактам — катаракта на мяжы стагоддзяў істотна «памаладзела». Доўгі час хрусталік выдаляўся толькі пасля канчатковага саспявання катаракты, таму пацыентаў з катарактай немінуча чакалі доўгія гады дыскамфорту, няўпэўненасці і нават бездапаможнасці, і акуляры ў дадзеным выпадку выратаваннем быць не маглі. А сёння сучасная тэхніка дазваляе ажыццяўляць хірургічнае ўмяшанне на любой стадыі развіцця катаракты: самай прагрэсіўнай методыкай з'яўляецца факаэмульсіфікацыя. Падчас аперацыі ўсе функцыі вока знаходзяцца пад кантролем камп'ютарных сістэм. Да таго ж рэабілітацыя пацыентаў пасля такой малатраўматычнай аперацыі адбываецца намнога хутчэй і з мінімальнай стратай працаздольнасці.

Дарэчы, медыкі раяць усім пасля 40 гадоў абавязкова раз у год наведваць урача-афтальмолага, паколькі менавіта ў гэтым узросце ўзнікаюць праблемы са зрокам — гэта могуць быць або ўзроставая дальназоркасць, або паталогія сятчаткі, або павышэнне ўнутрывочнага ціску. Ці могуць урачы хваробу спыніць? Калі, напрыклад, пацыент з глаўкомай знаходзіцца пад пастаянным медыцынскім наглядам, ён мае шанцы ўсё сваё жыццё пражыць відушчым. Між іншым, глаўкома — хвароба яшчэ больш «злая», чым катаракта, і працэнт інваліднасці ад глаўкомы вышэйшы, чым ад захворвання на катаракту. А лячэнне эфектыўнае толькі ў тым выпадку, калі дыягназ быў пастаўлены своечасова і калі захворванне не ў запушчанай стадыі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Дарэчы

### ГРЫП ПАДВОЙВАЕ РЫЗЫКУ ІНФАРКТУ І ІНСУЛЬТУ

**Брытанскія вучоныя высветлілі, чаму інфаркты і інсульты часцей здараюцца зімой.**

Паводле іх інфармацыі, грып і сур'ёзныя інфекцыі дыхальных пуцей значна павышаюць рызыку развіцця сардэчна-сасудзістых захворванняў. У першы тыдзень захворвання на грып, бранхіт ці пнеўманію верагоднасць развіцця інфаркту і інсульту падвойваецца.

Толькі для мужчын

# Такі няпросты прастатыт

**Прастатыт — запаленчае захворванне прастаты, якое на сёння адносяць да аднаго з найбольш распаўсюджаных пашкоджанняў палавой сферы мужчын рэпрадукцыйнага ўзросту (20—50 гадоў). Запушчаны прастатыт вядзе да розных ускладненняў — зніжэння палавой цягі, мужчынскай бясплоднасці, самыя жахлівыя з іх — адэнома і рак прастаты.**

Прастата — асаблівы мужчынскі орган. Яна складаецца з гладкамышачных валокнаў і залозістай тканкі, сабранай у долькі, якія раздзеленыя адна ад адной перагародкамі са злучальнай тканкі. Прастата размешчана на ніжнім полюсе мачавога пухіра і ахоплівае пачатковую частку мочаспускальнага канала (прастатычная частка). З бакоў да прастаты прылягаюць семявыя мяшэчкі, у якіх назапашваецца і саспявае сперма. Прастата выконвае мноства функцый:

— у мочаспусканні: мышачныя элементы прастаты фарміруюць своеасаблівы затвор, які рэгулюе акт мочаспускання, таму пры пашкоджанні прастаты можа ўзнікнуць як затрымка мачы, так і яе нетрыманне;

— у рэгуляцыі палавой функцыі: залозісты эпітэлій долек прастаты вырабляе спецыфічны сакрэт:

— эндакрынная функцыя прастаты: эпітэлій прастаты валодае здольнасцю вылоўліваць з крыві мужчынскія палавыя гармоны (тэстастэрон) і ператвараць іх у больш актыўныя формы (дэгідратэстастэрон); таксама некаторая колькасць палавых гармонаў сінтэзуецца непасрэдна ў прастаце; акрамя гэтага прастата сінтэзуе цэлы спектр біялагічна актыўных рэчываў — прастагладзінаў, якія ўдзельнічаюць у рэгуляцыі розных функцый арганізма. Адным з эфектаў прастагладзінаў з'яўляецца расшырэнне сасудаў і разрэджванне крыві, што аказвае спрыяльнае ўздзеянне на работу сардэчна-сасудзістай сістэмы і папярэджвае такія захворванні, як інфаркт міякарда, атэрасклероз. Такім чынам, прастата — адзін з найважнейшых органаў мужчынскай рэпрадукцыйнай сістэмы. Анатамічныя асаблівасці прастаты і яе размяшчэнне адыгрываюць важную ролю ў фарміраванні сімптомаў яе пашкоджання і ўскладненняў вострых і хранічных прастатытаў.

У залежнасці ад прычыны ўзнікнення выдзяляюць дзве асноўныя групы прастатыту — інфекцыйныя і кангестыўныя (застойныя). Інфекцыйны прастатыт узнікае ў выніку ўкаранення ў тканку залозы шкодных мікраарганізмаў (кішэчнай палачкі, стафілакокаў, стрэптакокаў, ганакокаў, хламідый і інш.). Узбуджальнік пранікае ў залозу па крывяносных і лімфатычных шляхах як з побач размешчаных органаў — мачавога пухіра, мочаспускальнага канала, прамой кішкі, так і з любых іншых, пашкоджаных запаленчым працэсам. Так званы кангестыўны прастатыт правакуе вянозны застой крыві і збіранне сакрэту прастаты ў самой залозе. Прастатыт развіваецца больш інтэнсіўна і пачынае праяўляць сябе пры наяўнасці наступных неспрыяльных фактараў:

- пераахаладжэнне арганізма;
- маларухомы лад жыцця;
- праца ў сядзячым становішчы (вадзіцелі, аператары і інш.);
- працяглае палавое ўстрыманне;
- рэгулярныя запоры;
- аслабленне імунітэту, стрэсы, няякаснае харчаванне.

Востры прастатыт развіваецца бурна, з хуткім павышэннем тэмпературы і ліхаманкай. Непакоіць моцны боль у прамежнасці, яечках, паясніцы. Нярэдка парушаецца мочаспусканне: яно становіцца частым і ўскладняецца. Магчымая і вострая затрымка мачы з-за ацёку шыйкі мачавога пухіра і мочаспускальнага канала.

Лячэнне **вострага прастатыту** павінна праводзіцца толькі пад кантролем урача! Чым раней яно распачата, тым больш гарантый поспеху. Хочацца асабліва падкрэсліць небяспеку самалячэння. Нярэдка хворыя самі сабе прызначаюць розныя цеплавыя працэдуры, якія часова супакойваюць боль. Яны не звяртаюцца па медыцынскую дапамогу, пры гэтым страчваецца каштоўны час, хвароба прагрэсуе. У выніку або развіваецца цяжкае ўскладненне, або востры працэс пераходзіць у хранічны.

**Для хранічнага** прастатыту характэрна чаргаванне перыядаў абвастрэння і рэмісіі. У перыяд абвастрэння хворыя звычайна скардзяцца на адчуванне ціску ў прамежнасці, тупы боль, які аддае ў крыж, прамую кішку, пахвінную вобласць. Часта ў запаленчы працэс уцягваюцца мочаспускальны канал, семявыя пухіркі, шыйка мачавога пухіра. Гэта ўскладняе цячэнне захворвання. З'яўляюцца сверб і смыленне ў мочаспускальным канале, мочаспусканне становіцца частым і балючым. У шэрагу выпадкаў пры доўгім цячэнні прастатыт можа стаць прычынай расстройства палавой функцыі. Уцягненне ж палавой сферы ў паталагічны працэс адбіваецца на псіхіцы і працаздольнасці хворых.

У комплекс лячэння ўваходзіць медыкаментозная тэрапія, фізіятэрапеўтычныя працэдуры. І вельмі важна выконваць усе назначэнні, накіраваныя на ліквідацыю ўсіх існуючых у арганізме ачагоў інфекцыі.

Катэгарычна забараняецца без ведама ўрача прымаць антыбактэрыяльныя прэпараты: яны эфектыўныя толькі тады, калі прызначаюцца з улікам адчувальнасці ўзбуджальніка прастатыту да медыкаментаў. Гэта вызначаецца бактэрыялагічным даследаваннем сакрэту прастаты. Таму бескантрольны прыём антыбіётыкаў або іншых лекаў, як правіла, спрыяе павышэнню ўстойлівасці мікробнай флоры да медыкаментаў, што вельмі ўскладняе далейшае лячэнне.

Для паляпшэння кровазвароту ў прастаце і ліквідацыі застою ў ёй сакрэту праводзіцца пальцавы масаж. Ён садзейнічае павышэнню тонусу мышачных валокнаў, змяншэнню застою вянознай крыві, выдзяленню сакрэту прастаты. Робіць масаж толькі ўрач, бо няўмелыя, грубыя дзеянні могуць выклікаць атрафію мышачных валокнаў залозы. Пры вострым прастатыце, а таксама ў перыяд абвастрэння хранічнага, масаж рабіць ні ў якім разе нельга. Варта падкрэсліць, што вызваленне залозы ад сакрэту і паляпшэнне кровазвароту ў ёй лепш за ўсё дасягаюцца рэгулярным палавым жыццём.

Сціханню запаленчых праяў садзейнічаюць таксама цеплавыя працэдуры: цёплыя сядзячыя ванны, гарачыя клізмы. Калі прастатыт суправаджаецца болем, урач параіць рабіць клізмы з абязбольвальнымі прэпаратамі.

Апошнім часам комплекс лячэння з поспехам дапаўняе іголкаўколванне. Яно станоўча ўздзейнічае не толькі непасрэдна на прастату, але і нармалізуе нейраэндакрынныя працэсы ў арганізме, аднаўляе ўраўнаважанасць працэсаў узбуджэння і тармажэння, а значыць, і палавую функцыю.

Важны кампанент комплекснага лячэння — рацыянальнае харчаванне. Ежа хворага на прастатыт павінна быць разнастайнай, пераважна малочна-раслiннай. Выключаюцца вяндліна, марынады, саленні, алкагольныя напоі.

Фізічная культура, водныя працэдуры, прагулкі павышаюць тонус арганізма, спрыяюць нармалізацыі ўсіх яго функцый. Аднак фізічнае перанапружанне таксама шкоднае.

**Народная медыцына** рэкамендуе ад прастатыту піць адвары з кветак ліпы, глогу, чабору, мяты, пялёсткаў чырвонай і белай ружы, насення кмену, лісця чорных парэчак, баркуну жоўтага. Адна з асноўных лекавых траў пры лячэнні прастатыту — грушанка. У народзе яе называюць «травой ад сарака хвароб». Таксама рэкамендуецца выкарыстоўваць пры гэтай немачы жывучку паўзучую, больш вядомую пад назвай гарлянка.

Прафілактыка прастатыту заключаецца ў своечасовым і поўным вылечванні запаленчых захворванняў мочаспускальнага канала, мачавога пухіра. Неабходна таксама сачыць за рэгулярным ачышчэннем кішэчніка. Людзям, якія працуюць пераважна ў сядзячым становішчы, рэкамендаваны пешыя прагулкі, бег, плаванне. Для здароўя мужчыны важныя таксама асаблівасці палавога жыцця. Аднолькава «раздражняюць» хваробу як доўгае ўстрыманне, так і вельмі высокая актыўнасць. Таму рэгулярнасць і ўмеранасць — найбольш прымальны варыянт.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на I квартал або I-е паўгоддзе 2008 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе ў рэдакцыю на адрас: **220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць у якасці прыза падпіску на II квартал 2008 г., гадзіннікі, футболкі, бейсболкі, печ СВЧ, тэлевізар «Віцязь» і суперпрыз — халадзільнік «Атлант». Карткі, наклееныя на паперу ці плёнку, або дасланыя **пасля 3 студзеня 2008 года** па паштовым штэмпелі атрымання да ўдзелу ў гульні не прымаюцца. Розыгрыш прызоў праводзіцца **8 студзеня 2008 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **да 19 студзеня**.

Атрымаць прыз можна ў рэдакцыі **да 20 сакавіка 2008 г.** пры прад'яўленні квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на I квартал або 1-е паўгоддзе 2008 года і пашпарта. Дастаўку печы СВЧ, тэлевізара і халадзільніка ажыццяўляе рэдакцыя. **Пасля 20 сакавіка** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

**Удачы ў гульні!**

**8 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на I квартал або I-е паўгоддзе 2008 года**

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ____________________

____________________

**Падпіска аформлена і аплачана ў** ____________________ (аддзяленне сувязі)

____________________ **на I кв. або I–е паўг. 2008 года**

**Хатні адрас і тэлефон** [ ] (індэкс) ____________________

____________________

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1 Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

**АБАНЕМЕНТ** на газету ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання)

Колькасць камплектаў

на 2008 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму (прозвішча, ініцыялы)

Куды (адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

**ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА** на газету (індэкс выдання)

ПВ | месца | літар

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

| Кошт | падпіскі | ______ руб. | Колькасць камплектаў | |
|---|---|---|---|---|
| | пераадрасоўкі | ______ руб. | | |

на 2008 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму (прозвішча, ініцыялы)

Куды (адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

